7 (168)
ліпень

Выдаецца
са студзеня 1993 г.

*Пасведчанне
аб рэгістрацыі
№ 1221
ад 14 студзеня 2013 г.*

Выходзіць 12 разоў
у год (з ліпеня 2003 г.)

# БЕЛАРУСКІ ГІСТАРЫЧНЫ ЧАСОПІС

**НАВУКОВА-ТЭАРЭТЫЧНЫ, НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНЫ ЧАСОПІС**

**Заснавальнікі:**

**Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва «Пачатковая школа», дзяржаўная навуковая ўстанова «Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт**

*Галоўны рэдактар Максім Навумавіч Гальпяровіч*

***Рэдакцыйная калегія:***
**Канстанцін Бандарэнка, Сымон Барыс, Пётр Брыгадзін, Рыгор Васілевіч, Вячаслаў Даніловіч, Валерый Жук, Мікалай Забаўскі, Віктар Іўчанкаў, Аляксандр Каваленя, Міхаіл Касцюк, Уладзімір Клюня, Веньямін Космач, Уладзімір Кошалеў, Васіль Кушнер, Надзея Кушнер, Уладзімір Ладысеў, Рыгор Лазько, Аляксандр Лакотка, Аляксей Літвін, Анатоль Люты, Вольга Ляўко, Ігар Марзалюк, Наталля Матусевіч, Аляксандр Радзькоў, Аркадзь Русецкі, Аляксандр Смолік, Сяргей Ходзін, Мечыслаў Часноўскі, Алег Яноўскі, Эдмунд Ярмусік.**

***Рэдакцыйная рада:***
**Уладзімір Адамушка, Юрый Бохан** (старшыня рады), **Марыя Бяспалая, Аляксандр Вабішчэвіч, Ала Галубовіч, Надзея Ганушчанка, Уладзімір Гілеп, Аляксандр Груша, Аляксандр Гужалоўскі, Таісія Доўнар, Дзяніс Дук, Ларыса Жэрка, Аляксандр Каханоўскі, Марына Краснова, Іван Крэнь, Аляксандр Кушнярэвіч, Вячаслаў Лазіцкі, Святлана Марозава, Леанід Мартынаў, Сяргей Новікаў, Алег Слука, Валерый Талкачоў, Людміла Трыгорлава, Уладзімір Тугай, Віктар Фядосік, Неаніла Цыганок, Анатоль Шаркоў.**

***Рэдакцыя:***
Намеснік галоўнага рэдактара — **Наталля Матусевіч**, рэдактар аддзела — **Надзея Кушнер**, мастацкае афармленне — **Уладзімір Малахаў**, вёрстка — **Надзея Пяткоўская**, карэктура — **Людміла Шчэрба**.

Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь
УА "Палескі дзяржаўны універсітэт"

## ЗМЕСТ

| | | |
|---|---|---|
| | Слова ад рэдакцыі | 3 |
| | **ПАЛІТЫЧНАЯ ГІСТОРЫЯ** | |
| Васіль Варонін | Княжанне Альгерда ў Віцебску | 4 |
| | **ГІСТАРЫЯГРАФІЯ** | |
| Сяргей Новікаў | Германская акупацыйная палітыка на тэрыторыі Прыбалтыкі і Беларусі ў 1941—1944 гг. | 15 |
| | **ЗНАХОДКІ І АДКРЫЦЦІ** | |
| Андрэй Чуткі | Дзед Уладзіміра Высоцкага — студэнт Кіеўскага камерцыйнага інстытута | 25 |
| | **КОЛА ВЕДАЎ** | |
| Вольга Келер | Асноўныя віды гарадскога права на беларускіх землях ВКЛ | 33 |

## ЗМЕСТ


| | | |
|---|---|---|
| | **КОЛА ВЕДАЎ** | |
| **Вольга Мядзведзева** | **Беларускі народны каляндар. Лета** | **38** |
| | **МЕТОДЫКА. ВОПЫТ** | |
| **Валерый Варганаў** | **Методыка вывучэння вуснай гісторыі: з вопыту работы Ворнаўскай сярэдняй школы** | **41** |
| **Ольга Забельникова** | **Мир древней истории** *(V класс)* | **51** |
| **Ольга Забельникова** | **Утверждение новой культуры** *(VIII класс)* | **57** |
| **Вячаслаў Лазіцкі** | **Канструяванне тэставых заданняў па гісторыі Беларусі для вучняў 6 класа** | **64** |
| **Аксана Колтан** | **Выхаваўча-адукацыйны праект "Твой нацыянальны герой"** | **71** |
| | **Содержание** | **79** |
| | **Summary** | **80** |



*У адпаведнасці з загадам Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь ад 4 ліпеня 2005 г. № 101 (у рэдакцыі загада Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь ад 2 лютага 2011 г. № 26) «Беларускі гістарычны часопіс» уключаны ў Пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў па гістарычных і юрыдычных навуках, а таксама па мастацтвазнаўстве і культуралогіі.*



***Адрас рэдакцыі: 220007, г. Мінск, вул. Фабрыцыуса, 5, кабінет 213.***
***Тэлефон: +375-29-569-83-95 (МТС).***
***http://www.p-shkola.by;***
***e-mail: bhc.redaktor@tut.by.***



***РУП «Выдавецтва «Пачатковая школа».***
Падпісана да друку 17.07.2013 г.
Выхад у свет 25.07.2013 г. Афсетны друк.
Фармат 60x841/8.
Ум. друк. арк. 9,3. Ул.-выд. арк. 11,4.
Наклад 960 асобнікаў. Зак. 1074.
*Надрукавана ў друкарні ААТ «Прамдрук».*
*Ліцэнзія № 02330/0494112 ад 11.03.2009 г.*
*220049, г. Мінск, вул. Чарняхоўскага, 3.*


*Да ведама аўтараў!*
***За дакладнасць прыведзеных у артыкулах фактаў і цытат адказнасць нясуць аўтары. Рэдакцыя можа друкаваць матэрыялы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтараў. Навуковыя артыкулы прымаюцца да разгляду з рэкамендацыяй кафедры (аддзела) вучэбнай або навуковай установы. Рэцэнзаванне арганізоўвае рэдакцыя. Да разгляду прымаюцца рукапісы аб'ёмам не больш за 20 старонак (кегль 14, праз 1,5 інтэрвала) у двух экзэмплярах (абавязкова на электронных носьбітах). Неабходна ў дапісах паведамляць свае прозвішча, імя і імя па бацьку, кароткія звесткі пра сябе, пашпартныя даныя (абавязкова асабісты нумар), адрас, тэлефон. Рукапісы не вяртаюцца.***


© «Беларускі гістарычны часопіс», 2013.

Вячаслаў ЛАЗІЦКІ

# Канструяванне тэставых заданняў па гісторыі Беларусі для вучняў 6 класа

*На сённяшні дзень настаўнік гісторыі мае магчымасць выбіраць сярод выданняў з тэставымі заданнямі тое, якое яму падабаецца больш. Аднак неабходна заўважыць, што далёка не ўсе тэставыя заданні складзены метадычна правільна. У многіх з іх сустракаюцца сур'ёзныя памылкі. У артыкуле прапанаваныя некаторыя рэкамендацыі па падрыхтоўцы тэставых заданняў, якія будуць садзейнічаць іх пісьменнаму складанню і выкарыстанню.*

Настаўнікі гісторыі пры распрацоўцы вучэбных заняткаў па гісторыі Беларусі для вучняў 6 класа даволі часта выкарыстоўваюць тэставыя тэхналогіі якасных і колькасных вымярэнняў вучэбных дасягненняў вучняў. Такі від кантрольна-ацэначнай дзейнасці папулярны таму, што дазваляе ахапіць гэтай дзейнасцю вялікую колькасць вучняў класа, хутка ацаніць узровень іх ведаў і ўменняў.

Разнастайныя віды вучэбнай дзейнасці школьнікаў, кантроль яе вынікаў, змяненні ў вучэбнай праграме патрабуюць вырашэння праблематыкі дыдактычных вымярэнняў. Безумоўна, увядзенне колькасных паказчыкаў педагагічных вымярэнняў з'яўляецца неабходным кампанентам для атрымання аб'ектыўных дадзеных пра стан і вынікі цэласнага педагагічнага працэсу ў ходзе вывучэння шасцікласнікамі гістарычнага матэрыялу. Для настаўнікаў гісторыі і вучняў у якасці дадатку да вучэбнага дапаможніка па гісторыі Беларусі ў 6 класе выдадзены рабочыя сшыткі з рознаўзроўневымі заданнямі, тэставыя матэрыялы розных аўтараў. Таксама настаўнікі гісторыі карыстаюцца для вымярэнняў вучэбных дасягненняў вучняў электроннымі сродкамі навучання (ЭСН) — праграмна-метадычным комплексам "Знак" і тэставым асяроддзем "Дзясяцібальны маніторынг"[1]. Згаданыя ЭСН грунтуюцца на прымяненні тэставых методык у адкрытых тэставых асяроддзях пры іх зместавым напаўненні карыстальнікамі. Аднак адзначым, што ў названых праграмных сродках, на наш погляд, не ў поўнай меры рэалізуецца рознаўзроўневы падыход пры ажыццяўленні кантролю і ацэньванні вынікаў вучэбнай дзейнасці школьнікаў у адпаведнасці з крытэрыямі дзясяцібальнай сістэмы ацэнкі з улікам спецыфікі вывучэння гісторыі Беларусі ў 6 класе[2]. Гэтая праблема характэрная і для большасці ство-



*ЛАЗІЦКІ Вячаслаў Лявонцьевіч.*
*Выконваючы абавязкі загадчыка кафедры гуманітарных навук, філасофіі і права Палескага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат педагагічных навук, дацэнт. Нарадзіўся ў 1963 г. у г. Пінск. У 1989 г. закончыў гістарычны факультэт БДУ. З 1989 г. па 2009 г. працаваў настаўнікам гісторыі СШ № 1 Пінска. Мае вышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю. У 2009 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю па тэме "Выкарыстанне электронных сродкаў навучання падчас вывучэння гісторыі Беларусі на трэцяй ступені агульнай сярэдняй адукацыі". Займаецца даследаваннем укаранення інфармацыйных педагагічных тэхналогій у працэс навучання. Аўтар больш за 50 навуковых публікацый, у тым ліку манаграфій "Навукова-метадычныя асновы выкарыстання ЭСН па сацыяльна-гуманітарных дысцыплінах (на прыкладзе гісторыі)" (Мн., 2009), "Электронны вучэбна-метадычны комплекс па дысцыплінах сацыяльна-гуманітарнага цыкла. Навукова-метадычныя асновы складання і сістэмнага прымянення" (Мн., 2012).*

раных настаўнікамі тэставых комплексаў. Яе магчыма пераадолець пры выкананні пэўных навукова абгрунтаваных метадычных умоў і патрабаванняў, якія мы разгледзім у дадзеным артыкуле.

Спецыфіка выкарыстання тэставых тэхналогій пры вывучэнні гісторыі Беларусі ў 6 класе вызначаецца шэрагам фактараў, якія неабходна ўлічваць. Па-першае, з 6 класа вучні пачынаюць сістэматычна вывучаць гісторыю Беларусі як вучэбны прадмет, для якога характэрна цэласнасць, адносная паўната і лагічная завершанасць падзейна-храналагічным прынцыпе[3]. Гэта стварае аптымальныя ўмовы для знаёмства вучняў з нацыянальным кампанентам школьных гістарычных ведаў, для фарміравання ў школьнікаў устойлівай сістэмы ведаў аб гістарычным шляху, пройдзеным беларускім народам. Па-другое, вывучаючы гісторыю Старажытнага свету ў 5 класе, вучні ўжо працавалі з тэстамі як сродкам кантролю ведаў і уменняў. Па-трэцяе, настаўнік таксама павінен улічваць псіхалагічнае развіццё шасцікласнікаў, у якіх пераважае прадметна-вобразнае мысленне.

Пад вучэбным педагагічным тэстам мы разумеем сістэму заданняў, складзеных паводле ўзрастання цяжкасці па спецыфічнай форме, якая дазваляе якасна вымерыць узровень і структуру падрыхтоўкі вучняў[4]. Асноўнымі перавагамі такіх тэставых заданняў над іншымі відамі кантролю ведаў з'яўляюцца іх сціслаcць, лагічная структураванасць, стандартызаванасць і адзіная працэдура правядзення і ацэнкі. Менавіта гэтыя крытэрыі ў параўнанні з традыцыйнымі формамі кантролю і ацэнкі ведаў і уменняў вучняў вылучаюць тэсты ў якасці найбольш прыдатных для ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў і праверкі яе адпаведнасці з Адукацыйным стандартам вучэбнага прадмета.

Міністэрствам адукацыі нарматыўна вызначаныя патрабаванні да падрыхтоўкі вучняў 6 класа па гісторыі Беларусі[5]. Вымярэнню падлягаюць аб'ём засвоеных ведаў і віды дзейнасці шасцікласнікаў па вучэбнаму прадмету, а таксама сфарміраванасць спецыяльных спосабаў вучэбнай дзейнасці, у аснове якіх знаходзяцца інтэлектуальныя ўменні: аналіз, сінтэз, індукцыя, дэдукцыя, сістэматызацыя, класіфікацыя і абагульненне. Традыцыйна пад дасягненнямі вучняў разумеюць аб'ём і ўзровень засвоеных ведаў, набытых уменняў і навыкаў, якія вызначаюцца адпаведнай ацэнкай. Разам з тым вучэбныя дасягненні кожнага вучня можна разглядаць і як працэс навучання: рух ад папярэдняга да новага ўзроўня авалодання ведамі і ўменнямі, і як вынік навучання: суаднясенне дасягнутага вучнем узроўня авалодання ведамі і ўменнямі адпаведна палажэнням Адукацыйнага стандарта. Заўважым, што ў адпаведнасці з 10-бальнай шкалой ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці[6] ў якасці прадуктыўных намі вызначаюцца трэці, чацвёрты і пяты ўзроўні засваення вучэбнага матэрыялу і спосабу дзейнасці *(гл. табліцу 1)*. Першы і другі ўзроўні мы адносім да рэцэптыўнай і рэпрадуктыўнай дзейнасці. Дакладнае выкананне тэставых заданняў на правільнае вызначэнне паслядоўнасці элементаў прапанаванага мноства, іх суаднясенне ў адкрытай форме ўяўляе сабой прадуктыўную дзейнасць вучня. У адпаведнасці з навукова вызначанай методыкай складання тэстаў[7] яны аб'ектыўна не даюць уяўлення, наколькі вучань праявіў сябе ў прадуктыўнай, творчай, праблемна-пошукавай дзейнасці, арыентаванай на здабыванне новых ведаў, рашэнне праблемных заданняў. Выйсце ў дадзенай сітуацыі бачыцца ў дапаўненні тэставых методык вымярэння вучэбных дасягненняў вучняў праблемным заданнем, на якое вучань павінен даць разгорнуты адказ.

*Табліца 1*

**Суаднясенне ўзроўню засваення вучэбнага матэрыялу і спосабу дзейнасці з тыпамі, відамі і формамі тэставых заданняў**

| Узровень заданняў | Узровень засваення вучэбнага матэрыялу | Тып, від тэставага задання | Форма тэставага задання |
|---|---|---|---|
| I | Распазнаванне, рэцэптыўна-рэпрадуктыўная дзейнасць | На распазнаванне (выбар правільнага элемента з прапанаванага мноства элементаў) | Закрытая |
| II | Узнаўленне па памяці, рэпрадуктыўная дзейнасць | На ўзнаўленне па памяці (выбар некалькіх правільных элементаў з прапанаванага мноства элементаў) | Закрытая |
| III | Асэнсаванае ўзнаўленне, прадуктыўная алгарытмічная дзейнасць | На ўзнаўленне на аснове разумення і выкарыстання ў знаёмай сітуацыі (пабудова паслядоўнасці з элементаў, знаходжанне суаднясення паміж элементамі прапанаваных мностваў) | Адкрытая |
| IV | Выкарыстанне ведаў у часткова незнаёмай сітуацыі, прадуктыўная эўрыстычная дзейнасць па здабыванню неабходнай інфармацыі | На выкарыстанне ведаў у часткова незнаёмай сітуацыі (свабодна сфармуляваны адказ) | Адкрытая |

*Працяг табліцы.*

| | | | |
|---|---|---|---|
| V | Прадуктыўная творчая дзейнасць па здабыванню новай інфармацыі, праблемна-пошукавая дзейнасць | На здабыванне новых ведаў, вырашэнне вучэбнай праблемы; на праверку правільнасці рашэння праблемы (рашэнне праблемных заданняў) | Адкрытая |

У тэсталогіі выпрацаваныя асноўныя навуковыя падыходы да канструявання тэставых заданняў. Прымяненне комплексаў тэставых заданняў, складзеных з улікам крытэрыяльна-арыентаванага падыходу, дазваляе вызначыць узровень вучэбных дасягненняў вучня адносна вызначанага крытэрыя, а не адносна групавой нормы ў рамках нарматыўна-арыентаванага падыходу ў канструяванні тэставых заданняў і інтэрпрэтацыі іх вынікаў *(гл. табліцу 2)*. У якасці сістэмных характарыстык тэставых заданняў па гісторыі Беларусі ў 6 класе намі вызначаюцца наступныя:

— зместавае напаўненне тэставых заданняў, якія ствараюць цэласную структуру ўсяго комплекса;

— паступовае ўзрастанне ўзроўню складанасці заданняў;

— структураванне зместу па тэмах з улікам шматкампанентнага складу школьных гістарычных ведаў (тэарэтычныя; факталагічныя (у тым ліку храналагічныя і картаграфічныя); метадалагічныя; ацэначныя);

— навуковасць і дакладнасць фармулёўкі задання, у якой не дапускаецца шматсэнсоўнасць разумення задання пры яго выкананні.

У адпаведнасці з тэсталогіяй і методыкай выкладання гісторыі ў 6 класе алгарытм дзейнасці настаўніка па канструяванню комплекса тэставых заданняў як тэхналагічнага сродка вымярэння вучэбных дасягненняў вучняў і дыдактычнай адзінкі ў мадэлюемай распрацоўцы вучэбнага занятку паслядоўна прадугледжвае:

— вызначэнне мэты кантрольна-ацэначнай дзейнасці, якая адпавядае мэтам школьнай гістарычнай адукацыі;

— вызначэнне зыходнага і прамежкавага ўзроўняў навучанасці школьнікаў у адпаведнасці з нарматыўнымі патрабаваннямі Адукацыйнага стандарта, вучэбнай праграмы, патрабаванняў 10-бальнай сістэмы ацэнкі;

— правядзенне структурна-функцыянальнага аналізу зместу вучэбнага матэрыялу для якаснага апісання, колькаснага вымярэння і адбору матэрыялу, які вучням неабходна засвоіць;

— стварэнне матрыцы тэставых заданняў як асновы для складання іх сукупнага комплексу *(гл. табліцу 3)*;

— выпрацоўка фармулёвак пытанняў і заданняў, арыентаваных на вызначэнне ўзроўню засваення вучэбнага матэрыялу і сфарміраванасці спосабаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці *(гл. табліцу 1)*;

— забеспячэнне адваротнай сувязі: правядзенне кантрольна-ацэначнай дзейнасці для атрымання інфармацыі пра якасць навучання і ацэнкі магчымасці пераходу вучня на наступны этап вучэбнай дзейнасці;

— ажыццяўленне працэсу карэкцыі навучання з улікам атрыманых і плануемых (нарматыўных) вынікаў[8].

*Табліца 2*

**Асноўныя навуковыя падыходы да канструявання тэставых заданняў**

| Крытэрыі для параўнання | Асноўныя навуковыя падыходы | |
|---|---|---|
| | Нарматыўна-арыентаваны | Крытэрыяльна-арыентаваны |
| Мэта тэставання | Параўнанне ўзроўню падрыхтоўкі тэстуемых вучняў па прадмеце | Атэстацыя тэстуемага ў адпаведнасці з яго ўзроўнем засваення вучэбнага матэрыялу і суадносінамі вучэбнай дзейнасці |
| Узровень зместавай дэталізацыі | Неістотны (выбар найбольш значных элементаў са зместу) | Падрабязны (распрацоўка тэставай спецыфікацыі, якая змяшчае ўсе элементы зместу, у адпаведнасці з якой складаюцца заданні) |
| Адбор і статыстычны аналіз тэставых заданняў | Адбор заданняў з сярэднім узроўнем цяжкасці і адрознівальнай магчымасцю | Адбор заданняў у адпаведнасці з кампанентамі школьных гістарычных ведаў; заданні выкарыстоўваюцца для састаўлення паралельных варыянтаў тэста і для складання аптымальнага бала для яго ацэнкі |
| Статыстычная апрацоўка вынікаў | Апрацаваныя балы грунтуюцца на статыстычных даных нарматыўнай групы; кожны індывідуальны бал для дадзенага тэста мае адназначнае суаднясенне з працэнтным эквівалентам, які вызначаны па нарматыўнай групе | Індывідуальны бал тэстуемага вызначаецца ў адпаведнасці з аб'ёмам вучэбнага матэрыялу, засвоенага ім паспяхова |

*Табліца 3*

**Прыкладная тэхналагічная матрыца комплексу тэставых заданняў**

| № тэставага задання | Узровень засваення | Кампаненты гістарычных ведаў, якія правяраюцца | Тып, від тэставага задання | Форма тэставага задання |
|---|---|---|---|---|
| 1 | I | Храналагічныя | На распазнаванне элементаў (з прапанаванага мноства выбар правільнага элемента) | Закрытая |
| 2 | I | Факталагічныя | На распазнаванне элементаў (з прапанаванага мноства выбар правільнага элемента) | Закрытая |
| 3 | I | Факталагічныя | На распазнаванне элементаў (з прапанаванага мноства выбар правільнага элемента) | Закрытая |
| 4 | II | Тэарэтычныя | На аднаўленне па памяці элементаў (з прапанаванага мноства выбар правільнага элемента) | Закрытая |
| 5 | II | Тэарэтычныя | На аднаўленне па памяці элементаў (з прапанаванага мноства выбар правільнага элемента) | Закрытая |
| 6 | III | Тэарэтычныя | На аднаўленне на аснове разумення і выкарыстання ў знаёмай сітуацыі элементаў (пабудова элементаў у правільнай паслядоўнасці) | Адкрытая |
| 7 | III | Тэарэтычныя | Аднаўленне элементаў на аснове разумення і выкарыстання ў знаёмай сітуацыі, суаднясенне прапанаваных элементаў, сістэматызацыя ведаў | Закрытая |
| 8 | III | Факталагічныя | Аднаўленне элементаў на аснове разумення і выкарыстання ў знаёмай сітуацыі, суаднясенне прапанаваных элементаў, сістэматызацыя ведаў | Адкрытая |
| 9 | IV | Тэарэтычныя | На прымяненне ведаў у часткова незнаёмай сітуацыі (прадстаўленне разгорнутага адказу) | Адкрытая |
| 10 | IV | Тэарэтычныя | На прымяненне ведаў у часткова незнаёмай сітуацыі (прадстаўленне разгорнутага адказу) | Адкрытая |

У адпаведнасці з прапанаваным алгарытмам прадстаўляем прыкладны комплекс тэставых заданняў, якія можна выкарыстаць для праверкі ведаў вучняў пасля вывучэння ў 6 класе раздзела "Беларускія землі ў старажытныя часы" вучэбнага дапаможніка для 6 класа, тэст для выніковага кантролю ведаў у канцы навучальнага года. Пры выкарыстанні прапанаваных тэставых заданняў настаўнік сам можа выбіраць іх колькасць.

## Тэст па раздзелу "Беларускія землі ў старажытныя часы"

**І. Выберыце правільны варыянт адказу.**

*1. Вызначыце храналагічны перыяд, на працягу якога адбылося першае пранікненне першабытнага чалавека на тэрыторыю Беларусі:*

*1) 600—300 тыс. гадоў таму;*

*2) 100—35 тыс. гадоў таму;*

*3) 24—21 тыс. гадоў таму;*

*4) 5—3 тыс. гадоў таму.*

*2. Выберыце перыяд старажытнай гісторыі, калі першабытны чалавек упершыню пачаў у гаспадарчай дзейнасці выкарыстоўваць металы:*

*1) палеаліт; 2) неаліт; 3) ранні жалезны век; 4) бронзавы век.*

*3. Выберыце з прапанаванага пераліку тое, што здабываў першабытны чалавек, калі займаўся бортніцтвам:*

*1) бурштын; 2) вугаль; 3) крэмень; 4) мёд.*

*4. З пералічаных ніжэй характарыстык прадметаў выберыце тую, якая адносіцца да паняцця "домніца":*

*1) від зброі;*

*2) упрыгожванне;*

*3) прадмет, які выкарыстоўвалі ў пахавальным абрадзе;*

*4) прыстасаванне для выплаўкі металу.*

*5. Вызначыце прылады працы і прыстасаванні, якія былі вынайдзены старажытным чалавекам у каменным веку:*

*1) домніца;*

*2) палка-капалка;*

*3) лук і стрэлы для палявання;*

*4) рала.*

**II. Выберыце правільны варыянт адказу.**

*6. Правільна вызначыце храналагічную пасля-доўнасць пачатку ўжывання прылад працы старажытным чалавекам:*

*а) барана-сукаватка;*

*б) драўляная саха з жалезным наканечнікам;*

*в) каменная або рогавая матыка;*

*г) палка-капалка.*

**III. Суаднясіце паняцце з яго азначэннем:**

*7. 1) родавая абшчына; 2) племя; 3) род; 4) статак.*

*а) Устойлівае аб'яднанне некалькіх родаў, звязаных агульнасцю паходжання;*

*б) калектыў кроўных родзічаў;*

*в) прыклад найбольш старажытнай супольнасці першабытных людзей;*

*г) калектыў старажытных людзей, якія былі звязаны паміж сабой сваёй роднасцю і агульнасцю паходжання, вялі агульную гаспадарку і сумесна валодалі прыладамі працы.*

*8. 1) арнамент; 2) скульптура; 3) курган; 4) міф.*

*а) Старажытнае народнае паданне;*

*б) стварэнне аб'ёмнага вобразу;*

*в) упрыгожванне керамічных вырабаў;*

*г) земляны насып над магілай памерлага.*

**IV. Напішыце гістарычнае паняцце.**

*9. .... — гэта месца пасялення першабытнага чалавека.*

*10. Кіраўнік рода ці племені, найбольш вопытны (звычайна пажылы) чалавек — гэта .... .*

*(Адказы: 1) 2; 2) 4; 3) 4; 4) 4; 5) 2, 3; 6) г, в, а, б; 7) 1 — г, 2 — а, 3 — б, 4 — в; 8) 1 — в, 2 — б, 3 — г, 4 — а; 9) стаянка; 10) старэйшына.)*

## Выніковы тэст па гісторыі Беларусі ў 6 класе

**I. Выберыце правільны варыянт адказу.**

*1. Тып пасялення першабытнага чалавека, знойдзены каля вёсак Юравічы і Бердыж:*

*1) будан;*

*2) гарадзішча;*

*3) селішча;*

*4) стаянка.*

*2. Выберыце прыладу працы, якая сведчыць аб прысвойваючым характары гаспадарання старажытнага чалавека:*

*1) барана-сукаватка;*

*2) драўлянае рала;*

*3) матыка;*

*4) палка-капалка.*

*3. Выберыце горад, які, па звестках старажытных летапісаў, быў адным з цэнтраў усходнеславянскага племяннога аб'яднання радзімічаў:*

*1) Гомель;*

*2) Менск;*

*3) Полацк;*

*4) Тураў.*

*4. Выберыце імя першага гістарычна вядомага менскага князя:*

*1) Барыс; 2) Глеб; 3) Рагвалод; 4) Усяслаў.*

*5. На картасхеме падпішыце старажытны беларускі горад — буйны цэнтр племяннога аб'яднання крывічоў.*




*6. Правільна вызначыце назву сухапутнага шляху гандлёвых адносін ва ўсходніх славян, які ляжыць паміж дзвюма рэкамі:*

*1) волак;*

*2) гасцінец;*

*3) павоз;*

*4) пагост.*

*7. Выберыце імя вярхоўнага бога ва ўсходніх славян, культ якога выводзіцца з часоў індаеўрапейскай супольнасці бронзавага веку:*

*1) Бялун;*

*2) Вялес;*

*3) Пярун;*

*4) Чур.*

*8. Выберыце тэрмін, які абазначае веру чалавека ў існаванне многіх багоў:*

*1) каталіцызм;*

*2) манатэізм;*

*3) хрысціянства;*

*4) язычніцтва.*

*9. На картасхеме падпішыце горад, дзе было створана самае ранняе Евангелле з тых, што захаваліся на сучаснай тэрыторыі Беларусі.*



*10. Вызначыце, пра што сведчаць падзеі беларускай гісторыі, якія адбыліся ў 992 г., 1005 г.:*

*1) пра канфесійны падзел у хрысціянстве;*

*2) пра масавае хрышчэнне насельніцтва беларускіх зямель;*

*3) пра распаўсюджанне каталіцтва на беларускіх землях;*

*4) пра распаўсюджанне хрысціянства на беларускіх землях.*

*11. Вызначыце прылады працы і прыстасаванні, якія былі вынайдзены старажытным чалавекам у раннім жалезным веку:*

*1) домніца;*

*2) палка-капалка;*

*3) лук і стрэлы для палявання;*

*4) рала.*

*12. Вызначыце, якія гістарычныя асобы былі сучаснікамі:*

*1) Ефрасіння Полацкая;*

*2) Ізяслаў Уладзіміравіч;*

*3) Усяслаў Чарадзей;*

*4) Яраслаў Мудры.*

**II. Выберыце правільны варыянт адказу.**

*Правільна вызначыце храналагічную паслядоўнасць пачатку ўжывання прылад працы старажытным чалавекам.*

*13. а) барана-сукаватка;*

*б) домніца;*

*в) матыка;*

*г) палка-капалка.*

*14. Правільна расстаўце ў храналагічнай паслядоўнасці наступныя падзеі:*

*а) барацьба Брачыслава Ізяславіча з Кіевам за волакі;*

*б) бітва на Нямізе;*

*в) пачатак барацьбы Полацка супраць крыжакоў;*

*г) паход кіеўскага князя Мсціслава на Полацк.*

*15. Правільна расстаўце ў храналагічнай паслядоўнасці наступныя падзеі:*

*а) рэлігійна-асветніцкая дзейнасць Кірылы Тураўскага;*

*б) утварэнне епархіі ў Тураве;*

*в) утварэнне епархіі ў Полацку;*

*г) хрышчэнне Русі.*

**III. Правільна суаднясіце гістарычныя элементы.**

*16. Суаднясіце даты і адпаведныя ім падзеі:*

*1) 10—15 тыс. гадоў таму;*

*2) 4—3 тыс. гадоў таму;*

*3) 3—1,5 тыс. гадоў таму;*

*4) пачатак 2-га тыс. да н.э. — канец VIII ст. да н.э.*

*а) Аб'яднанне родаў у плямёны;*

*б) бронзавы век на тэрыторыі Беларусі;*

*в) пераход першабытных людзей да аселага ладу жыцця;*

*г) рассяленне індаеўрапейцаў у Еўропе.*

*17. Суаднясіце азначэнне катэгорый залежных сялян з іх азначэннямі:*

*1) закупы;*

*2) "людзі";*

*3) радовічы;*

*4) халопы.*

*а) Катэгорыя залежных сялян, якія ўзялі ў феадала пазыку;*

*б) катэгорыя залежных сялян, якія працуюць на феадала па дамоўленасці;*

*в) катэгорыя сялян-слуг, якія цалкам страцілі асабістую свабоду;*

*г) асабіста вольныя сяляне-абшчыннікі.*

*18. Суаднясіце паняцце з яго азначэннем:*

*1) абраз;*

*2) галаснік;*

*3) плінфа;*

*4) скрыпторый.*

*а) Замураваны ў сцяну храма посуд;*

*б) майстэрня па перапісцы кніг;*

*в) твор станковага жывапісу;*

*г) шырокая і плоская абпаленая цэгла.*

**IV. Напішыце гістарычнае паняцце (тэрмін) ці гістарычную назву (імя).**

*19. Абшчына, у якой роднасць членаў лічылася па жаночай лініі — гэта ....*

*20. .... — атрад узброеных і спецыяльна навучаных ваеннай справе людзей.*

*21. .... — гэта ўмацаваная частка старажытнага горада.*

*22. Невялікі рэлігійны твор з павучальным зместам — гэта ....*

***(Адказы: 1) 4; 2) 4; 3) 1; 4) 2; 5) 1 — Полацк; 6) 1; 7) 4; 8) 4; 9) 4 — Тураў; 10) 4; 11) 1, 4; 12) 2, 4; 13) г, в, а, б; 14) а, б, г, в; 15) г, в, б, а; 16) 1 — а, 2 — в, 3 — г, 4 — б; 17) 1 — а, 2 — г, 3 — б, 4 — в; 18) 1 — в, 2 — а, 3 — г, 4 — б; 19) мацярынскі род; 20) дружына; 21) дзядзінец; 22) прытча.)***

Аналіз практыкі прымянення тэставых тэхналогій у сістэме дыдактычнага кантролю пры вывучэнні гісторыі Беларусі ў 6 класе дазваляе вызначыць найбольш тыповыя праблемы, якія звязаны з адмоўнымі псіхалагічнымі эмацыянальнымі рэакцыямі вучняў на працэдуру тэставання:

— негатыўныя псіхалагічныя рэакцыі на прад'яўленне тэставых заданняў на фоне высокага ўзроўню трывожнасці вучня;

— уздзеянне адмоўнага вопыту выканання тэставых заданняў;

— незразумелая вучням форма прадстаўленых заданняў — недакладна і некарэктна ўжытыя фармулёўкі;

— уплыў на вынік абмежавання на выканан-

не тэставых заданняў па часе для вучняў з розным узроўнем псіхалагічнай мадальнасці.

На наш погляд, прыведзеныя сітуацыі магчыма мінімізаваць ці ўвогуле пераадолець пры выкананні наступных умоў:

— развіццё тэставай культуры вучняў і настаўнікаў;

— псіхолага-педагагічная падрыхтаванасць вучняў да працэдуры тэставання і прад'яўлення розных тыпаў, форм тэставых заданняў;

— улік патрабаванняў тэсталогіі да комплексаў тэставых заданняў;

— улік індывідуальных псіхалагічных асаблівасцяў вучняў: прадастаўленне ім магчымасці вызначаць індывідуальную траекторыю праходжання тэставання (вучань самастойна выбірае тэмп і чарговасць выканання заданняў).

Паспяховае канструяванне тэставых заданняў і эфектыўнае ўжыванне тэставых тэхналогій якасных і колькасных вымярэнняў вучэбных дасягненняў вучняў у практыцы выкладання гісторыі Беларусі ў 6 класе немагчыма без прытрымлівання метадычных умоў:

— навуковасць зместу і забеспячэнне магчымасці арганізацыі вучэбнай дзейнасці школьнікаў на навукова абгрунтаваных прынцыпах, што склаліся ў тэсталогіі і дыдактыцы;

— адпаведнасць комплексу тэставых заданняў сваёй дыдактычнай ролі па дыягностыцы і ацэнцы паспяховасці вучэбнай дзейнасці вучняў пры вывучэнні гісторыі Беларусі;

— комплекснае выкарыстанне тэхналагічнага і дыдактычнага патэнцыялу тэставых тэхналогій, электронных і традыцыйных сродкаў навучання (ЭСН, вучэбны дапаможнік, рабочы сшытак, хрэстаматыя, атлас);

— выкарыстанне алгарытму пры кіраванні вучэбна-пазнавальнай дзейнасцю шасцікласнікаў;

— інфармаванне вучняў аб бліжэйшых і аддаленых мэтах навучання і іх дасягненні;

— прымяненне тэставых тэхналогій на аснове сфарміраванай у школьнікаў высокай матывацыі да выніковай вучэбнай дзейнасці;

— сістэмнае прымяненне тэставых тэхналогій пры арганізацыі вучнёўскай дзейнасці па засваенню шматкампанентнага складу вучэбных гістарычных ведаў і спосабаў вучэбнай дзейнасці;

— адпаведнасць зместу і структуры тэставых заданняў Адукацыйнаму стандарту і вучэбнай праграме, вучэбнаму гістарычнаму матэрыялу і спосабам вучэбнай дзейнасці;

— канструяванне тэставых заданняў з улікам патрабаванняў крытэрыяльна-арыентаванага падыходу;

— ажыццяўленне (пры неабходнасці) карэкцыі для дасягнення вучнямі прадуктыўных узроўняў засваення вучэбнага гістарычнага матэрыялу.

Вызначаныя палажэнні неабходна ўлічваць у якасці базавых метадычных патрабаванняў пры ўжыванні тэставых тэхналогій вымярэнняў вучэбных дасягненняў вучняў у працэсе вывучэння гісторыі Беларусі ў 6 класе. Выкананне прапанаванага алгарытму і вызначаных метадычных умоў у спалучэнні з традыцыйнымі сродкамі кантролю і ацэнкі (кантроль і ацэнка праблемнага задания, на якое вучань дае разгорнуты адказ) дазволіць настаўніку якасна распрацоўваць кантрольнадыягнастычны матэрыял і рэалізоўваць яго тэхналагічны і дыдактычны патэнцыял у сістэме вучэбных заняткаў па гісторыі Беларусі ў 6 класе.

[1] Программно-методический комплекс "Знак" [Электронный ресурс]. — Электрон. дан. и прогр. (71 Мб). Мн., 2004. — электрон. опт. диск (CD-ROM); Тестирующая среда "Десятибалльный мониторинг" [Электронный ресурс]. — Электрон. дан. и прогр. (30 Мб). Мн., 2003. — 1 электрон. опт. диск (CD-ROM).

[2] Десятибалльная система оценки результатов учебной деятельности учащихся: Инструктивно-методические материалы / Под ред. О.Е.Лисейчикова. Мн., 2002.

[3] Усеагульная гісторыя. Гісторыя Беларусі. V—XI класы. Вучэбныя праграмы для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі. Мн., 2012; Концепция учебного предмета "Всемирная история. История Беларуси" // Гісторыя: праблемы выкладання. 2009. № 3. С. 3—12.

[4] Аванесов В.С. Форма тестовых заданий. Учебное пособие для учителей школ, лицеев, преподавателей вузов и колледжей. М., 2005. С. 18—19.

[5] Образовательный стандарт учебного предмета "Всемирная история. История Беларуси" (5—11 классы) // Беларускі гістарычны часопіс. 2009. № 7. С. 18—21.

[6] Десятибалльная система оценки результатов учебной деятельности учащихся: Инструктивно-методические материалы / Под ред. О.Е.Лисейчикова. Мн., 2002.

[7] Звонников В.И., Челышкова М.Б. Современные средства оценивания результатов обучения: учеб. пособие. М., 2007; Майоров А.Н. Теория и практика создания тестов для системы образования. (Как выбирать, создавать и использовать тесты для целей образования). М., 2001; Дидактические тесты: технология проектирования: Методическое пособие для разработчиков тестов / А.М.Радьков, Е.В.Кравец, Б.Д.Чеботаревский. Мн., 2004; Челышкова М.Ю. Теория и практика конструирования педагогических тестов: учебное пособие. М., 2002.

[8] Десятибалльная система оценки результатов учебной деятельности учащихся: Инструктивно-методические материалы / Под ред. О.Е.Лисейчикова. Мн., 2002; Образовательный стандарт учебного предмета "Всемирная история. История Беларуси" (5—11 классы) // Беларускі гістарычны часопіс. 2009. № 7. С. 18—21; Гісторыя Беларусі са старажытных часоў да сярэдзіны XIII ст. : вучэб. дапам. для 6-га класа агульнаадукац. устаноў з беларус. мовай навучання; пад рэд. Г.В.Штыхава, Ю.М.Бохана. Мн., 2009.